

Артикул № 83322

Даты поездки:

**сб, 09.01.2021 - сб, 09.01.2021**

Длительность: **1 дней**

Цена: **65 р.**

Туруслуга: **0 р.**

# Каляды пад Мінскам

**Маршрут:** Музей народной архитектуры и быта

Выезд из городов: Минск
Ночные переезды: 0

# Программа тура

День 1
*сб, 09.01.2021*

Пачатак экскурсіі: 10.30, Мінск, пр. Незалежнасці 31-А, дом-музей РСДРП (пл. Перамогі).

Беларускі скансен — Гарадзішча — сядзіба-музей "Стары Менск".
Спачатку едзем у Музей народнай архітэктуры і побыту ў Азярцы — выдатны музей пад адкрытым небам, дзе дэманструецца народная традыцыйная культура ў звезеных з розных куткоў Беларусі драўляных пабудовах. Вас чакае незвычайнае падарожжа па вуліцах вёскі XIX стагоддзя ў дзіўны свет народнай фантазіі. Свет сыходзячай у нябыт драўлянай Беларусі набывае тут бачныя рысы, жывыя фарбы, гукі і пахі...
Вы ўбачыце уніяцкую Свята-Пакроўскую царкву XVIII стагоддзя, велізарны грамадскі свіран, прыдарожную капліцу-ратонду, карчму і млын XIX стагоддзя, кузню, народную школу... Тут жа "сядзіба пчаляра" з выставай арыгінальных прадметаў пчалярства. А галоўнае — разнастайныя тыпы сельскіх падворкаў. Гэта і сядзібы лінейнага "пагоннага" сялянскага двара, і сядзібы замкнёнага "вяночны" тыпу — якая векавая мудрасць у кожным з іх! Падчас інтэрактыўнай экскурсіі наведвальнікі падарожнічаюць па музейнай вёсцы і знаёмяцца з дамамі і іх інтэр'ерамі, пасля чаго гуляюць у традыцыйныя гульні і танчаць пад акампанемент жывой народнай музыкі. У гэтым музеі, размешчаным у надзвычай маляўнічай мясцовасці, Вы акунецеся ў цудоўны свет народнай фантазіі, зробіце выдатныя фатаздымкі!

А потым едзем глядзець вытокі летапіснага Менска — на рацэ Менцы пад велічнымі валамі гарадзішча XI стагоддзя ў аднаіменным пасяленні Гарадзішча. Супрацьстаўленне войска Полацкага князя Ўсяслава Чарадзея і войска Кіеўскіх князёў Яраславічаў у сярэдзіне XI стагоддзя знайшло адлюстраванне ў хроніцы "Аповесць мінулых часоў" і стала першым успамінам пра горад Менск — пад 1067 годам. Валы Гарадзішча добра захаваліся, з іх вышыні (а гэта 9-ці павярховага дому вышыня!) Глеб Лабадзенка — апантаны журналіст-краязнаўца і заснавальнік у Гарадзішчы музейнай прасторы — раскажа драматычную гісторыю той бітвы, той эпохі, шляхі здрад і перамог, гісторыю інтрыг і саюзаў…
Уявіць дакладней дух той эпохі нам дапаможа знакаміты рэканструктар і гісторык Юрась Усціновіч. Разам з паплечнікам нам пакажуць рыцарскія баёўкі, баі на мячах, стральбу з лука, мятанне сякер. І Вы, шаноўныя турысты, зможаце атрымаць навыкі боя на мячах, сфатаграфіравацца ў стылевай амуніцыі сярэднявечча…

Далей наш шлях ляжыць у каларытную сядзібу-музей "Стары Менск" пад старадаўнімі валамі.
Пасля смачнага абеда Глеб Лабадзенка правядзе экскурсію па музеі з унікальнымі артэфактамі X-XI стагоддзяў (знаходкі археалагічных раскопаў — іх больш 500. Пад аповед Глеба Лабадзенкі жыцце людзей таго часу стане больш зразумелым, можна будзе ўявіць сабе падзеі тысячагадовай даўніны і зразумець, што Мінск меў слаўны шлях. Цяпер Вы будзеце ведаць, дзе пачынаўся наш Менск! Падчас экскурсіі Глеб Лабадзенка — заснавальнік курсаў беларускай мовы "Мова Нанова" — як і заўсёды, падзеліцца моўнымі цікавосткамі і адкажа на Вашыя пытанні, датычныя беларускай мовы.

Вяртанне ў Мінск ~17.00.

# Дополнительная информация

**Включено в стоимость тура**

- Праезд аўтобусам туркласса
- Экскурсійнае суправаджэнне па маршруце
- Наведванне Музея народнай архітэктуры і побыту ў Азярцы
- Інтэрактыўная экскурсія па музею з жывой музыкай
- Майстар-клас па старадаўніх танцах
- Экскурсія па валах Гарадзішча
- Экскурсія ў музей "Стары Менск"
- Рэканструкцыя рыцарскіх баёў
- Фотазона: даспехі
- Абед на сядзібе

**Оплачивается отдельно**

- нет

**Примечание**

Зніжка для дзіцяці да 17 гадоў - 10 рублёў.

Фото: Сергей Мельник.

# Где купить?

Виаполь

**Минск, ул. Интернациональная 14, офис 4**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Телефон: | +375 (17) 270 00 60 | Время работы: | Пн. - Пт. | 09:00 - 18:00 |
| | +375 (17) 270 00 84 | | Сб. - Вс. | Выходной |
| | +375 (17) 270 00 85 | | | |
| | +375 (29) 689 15 39 | | | |
| | +375 (29) 779 15 39 | | | |